# XI СЕСІЯ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АСАМБЛЕІ ААН

НЬЮ-ЙОРК, 22 снежня. (ТАСС). Ранішняе пленарнае пасяджэнне Генеральнай Асамблеі 21 снежня пачалося з абмеркавання скаргі Францыі, Англіі і Ізраіля на тое, што ўрад Егіпта нібыта парушае правы чалавека і прынцыпы міжнароднага права ў адносінах да англійскіх і французскіх грамадзян і яўрэяў, якія знаходзяцца ў Егіпце.

Аб поўнай неабгрунтаванасці англа-французскіх скаргаў гаварылі прадстаўнікі Сірыі, Іярданіі, Савецкага Саюза.

Дэлегат Сірыі Зейн Эд-Дзін падкрэсліў, што агрэсары аказаліся ў ізаляцыі. Гэтым, напэўна, і тлумачыцца іх упорнае імкненне адцягнуць увагу ад сваіх непрыстойных дзеянняў. Зейн Эд-Дзін абвергнуў таксама сцвярджэнні французскай дэлегацыі аб тым, быццам Сірыя «накоплівае зброю», ствараючы гэтым «пагрозу новага канфлікту».

Прадстаўнік ЗША Уодсварт у сваім выступленні прызнаў, што ўрад Егіпта мае права прымаць меры з мэтай забеспячэння сваёй бяспекі, але тут-жа заявіў, што ўрад ЗША выказваў Егіпту «свой неспакой» адносна таго, што ён назваў «дрэнным абыходжаннем» з некаторымі грамадзянамі.

Прадстаўнік Іярданіі Рыфаі ў яркім выступленні выкрыў сэнс так званай скаргі Англіі, Францыі і Ізраіля. Гэты манеўр, сказаў ён, быў зроблен прадстаўнікамі краін-інтэрвентаў для дасягнення пэўных палітычных мэт. Аднак новае абмеркаванне прывядзе толькі да яшчэ большага выкрыцця злачынстваў агрэсараў супраць егіпецкага народа.

Прадстаўнікі Егіпта, працягваў В. В. Кузнецоў, даказалі тут, што з боку егіпецкага ўрада не было дапушчана парушэння правоў чалавека, і скарга Англіі, Францыі і Ізраіля пазбаўлена падставы. Егіпет дзейнічае як суверэнная дзяржава, захоўваючы нормы міжнароднага права. У даным выпадку, сказаў ён, тым больш няма прадмету для абмеркавання, бо ў адносінах да англійскіх і французскіх грамадзян і яўрэяў не ўжываюцца насіллі.

Паўстае пытанне, сказаў далей Кузнецоў, навошта-ж спатрэбілася Англіі, Францыі і Ізраілю, якія ўчынілі агрэсію супраць Егіпта, выстаўляць гэтае штучнае пытанне перад Генеральнай Асамблеяй? Шуміха вакол быццам-бы зробленых Егіптам парушэнняў правоў чалавека ўзнята перш за ўсё для таго, каб збіць з панталыку грамадскую думку, адцягнуць яе ўвагу ад тых варварскіх разбурэнняў і злачынстваў, якія зроблены і робяцца войскамі Англіі, Францыі і Ізраіля ў Егіпце. Не выпадкова гэты адцягваючы манеўр спатрэбіўся агрэсарам іменна цяпер, калі перад усім светам усё паўней раскрываецца злавесны малюнак іх злачынстваў супраць народа Егіпта.

В. В. Кузнецоў прывёў рад новых фактаў аб зверствах войск Англіі, Францыі і Ізраіля ў Егіпце і, у прыватнасці, аб варварскіх злачынствах агрэсараў у Порт-Саідзе.

Кіраўнік савецкай дэлегацыі ўказаў, што арабскае насельніцтва праследуецца і на тэрыторыі самога Ізраіля. З арабамі абыходзяцца ў Ізраілі як з «няпоўнацэннымі грамадзянамі», пазбаўляюць іх грамадзянскіх і рэлігійных свабод, экспрапуць частку сваіх войск у зоне Суэцкага канала пад выглядам удзелу іх у расчыстцы канала. Друк паведамляе, што ўрад Ізраіля мае намер усяляк цягнуць з эвакуацыяй сваіх войск з егіпецкай тэрыторыі і ў прыватнасці не мае намеру вывесці іх з Газы. Спробы навязаць ААН разгляд гэтай скаргі можна вытлумачыць толькі тым, што Англія, Францыя і Ізраіль па-ранейшаму не адмовіліся яшчэ ад сваіх агрэсіўных імкненняў у адносінах да Егіпта.

Генеральная Асамблея, заявіў прадстаўнік СССР, не можа прайсці міма гэтай трывожнай акалічнасці. Да таго часу, пакуль англійскія, французскія і ізраільскія войскі не будуць поўнасцю выведзены з егіпецкай тэрыторыі, нельга гаварыць аб спыненні агрэсіі гэтых дзяржаў супраць Егіпта. Задача Генеральнай Асамблеі ў цяперашні час заключаецца ў тым, каб дабіцца неадкладнага і поўнага спынення агрэсіі супраць Егіпта і прыняцця тэрміновых мер па ліквідацыі вынікаў гэтай агрэсіі. Нельга дапусціць, каб агрэсары, якія прабуюць выступаць у ролі абвінаваўцаў сваёй ахвяры, маглі адцягнуць увагу Генеральнай Асамблеі ад гэтай асноўнай задачы.

Савецкі прадстаўнік падкрэсліў, што ініцыятары паклёпніцкай кампаніі супраць Егіпта — Англія і Францыя — парушаюць правы чалавека ў радзе краін, народы якіх самаадданна змагаюцца за сваю свабоду і незалежнасць. У якасці прыкладаў ён прывёў падаўленне англійскімі імперыялістамі нацыянальна-вызваленчага руху на Кіпры, у Малайі, Кеніі

З поўным тэкстам дакумента магчыма азнаёміцца ў бібліятэцы